**АД ФАЛЬКЛОРНЫХ ГУРТОЎ – ДА РЭГІЯНАЛЬНЫХ ШКОЛ МАСТАЦТВА ВУСНАЙ ТРАДЫЦЫІ**

ШАНОЎНАЕ СПАДАРСТВА!

Паважаныя ўдзельнікі імпрэзы, замежныя госці, выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты, магістранты і аспіранты, калегі з навучальных, а таксама навуковых установ, удзельнікі фальклорных калектываў!

Як рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў маю гонар павіншаваць вас з нагоды адкрыцця XIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання»!

У XXI стагоддзі ўзрастае роля культуры як рухальнай сілы грамадскага развіцця. Спецыялісты канстатуюць, што сацыяльныя змены маюць у асноўным культурную матывацыю. Аналітыка падзей у сучасным свеце грунтоўнае таму сведчанне. Нават глабалізацыя не здольная дэвальваваць значэнне для кожнага народа яго культуры і крыніцы, якая яе сілкуе, – фальклорнай спадчыны.

Звяртаючыся да нядаўніх падзей міжнароднага культурнага абмену, адзначым, што з 30 лістапада 2018 года па 26 студзеня 2019 года ў сталіцы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў Абу-Дабі ладзіўся Sheikh Zayed Heritage Festival, у якім браў удзел шэраг навучальных і даследчых устаноў, у тым ліку наш універсітэт. Мерапрыемствы, што адбыліся ў межах гэтага форуму, адлюстравалі намаганні былога прэзідэнта Эміратаў шэйха Зайда бен Султана Аль Нахайяна, у гонар якога і быў створаны фестываль, на прыкладзе сваёй краіны дэманстраваць імкненне людзей розных краін, культур да дыялогу, добрасуседства, паважлівых стасункаў, міру ў свеце. На фестывальных пляцоўках традыцыйнае мастацтва сваіх народаў (спевы, танцы, інструментальную музыку, абрады і рамёствы) сёлета дэманстравалі калектывы з Аргенціны, Арменіі, Беларусі, Егіпта, Індыі, Казахстана, Катара, Кітая, Марока, Расіі, Сербіі, Узбекістана, Украіны і іншых краін свету.

Айчынную культуру на гэтым фэсце прадставілі студэнты менавіта нашага ўніверсітэта – гурт «Агнявец» кафедры этналогіі і фальклору пры падтрымцы яе дудароў і танцораў, на чале са старшым выкладчыкам, кандыдатам педагагічных навук Наталляй Петуховай. Аўтэнтычныя спевы, дударская музыка, а таксама побытавы беларускі танец вабілі да нашага фальклору шмат замежнікаў – удзельнікаў і гасцей фэсту. У культурным абмене на фестывальных выступах-перформансах бралі паспяховы ўдзел і мастакі з кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Запрашэнне студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта на гэты прадстаўнічы форум – сведчанне прызнання шматгадовай працы па этнакультурным выхаванні і этнамастацкай адукацыі ў Беларусі, самае непасрэднае дачыненне да якіх мае наш універсітэт.

Гісторыя канферэнцыі яскрава сцвярджае сучасную тэндэнцыю дасканалення методык і спецыфікі этнакультурнага выхавання на беларускай глебе. Замест калісьці адзінкавых дзіцячых і маладзёжных фальклорных гуртоў, сёння мы маем кагорту моцных і паслядоўна сфарміраваных буйных рэгіянальных школ мастацтва вуснай традыцыі, і на іх чале – шэраг надзвычай таленавітых этнапедагогаў. Варта адзначыць: Тарэсу Адамовіч, Чэслава Жыха (Гродзенскае Панямонне); Антаніну Абрамовіч, Міколу Козенку, Ларысу Рыжкову, Марыю Снітко і Лізавету Пятроўскую (Цэнтральная Беларусь); Алену Зачук, Валянціну Уласаву і Вераніку Хомбак (Віцебскае Падзвінне); Вольгу Дульскую і Сяргея Выскварку (Гомельскае Палессе); Алу Карпаву і Ларысу Лізякіну (Брэсцкае Палессе); Алега Белага (Магілёўскае Падняпроўе), а таксама многіх, многіх іншых. Кожная з пастаянна абнаўляемых фальклорных суполак, створаных гэтымі людзьмі (а яны адначасова з'яўляюцца носьбітамі традыцыі і майстрамі ў галіне яе перадачы), вартая статусу прыналежнасці да нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Такую спадчыну ўважліва адсочваюць, а таксама бяруць пад ахову спецыяльнымі нарматыўнымі дакументамі: ад міжнародных канвенцый да міжнародных або рэгіянальных указаў, спісаў і інвентароў. Складаюць пералікі і спісы гісторыка-культурнай, а таксама нематэрыяльнай культурнай спадчыны і айчыннае Міністэрства культуры (зацвярджае гэтыя спісы Савет Міністраў), і міжнародная супольнасць, у дадзеным выпадку ўвасобленая ў правамоцных структурах ЮНЕСКА. Трапляюць у вышэйадзначаныя спісы з'явы культуры, абавязковае патрабаванне да якіх – «жывое» бытаванне спадчыны ў асяродках яе носьбітаў. Так, пад ахову бяруць толькі тыя абрады, звычаі, стылі і формы выканання народных песень і танцаў, тэхналогіі народных рамёстваў, якія «сёння і зараз» перадаюцца паміж пакаленнямі. Таму значэнне педагогаў, настаўнікаў, лідараў навучання фальклору недаацаніць ужо вельмі складана. Сапраўды, гэта найлепшыя людзі краіны, што цягам усяго свайго жыцця дбаюць пра яе будучыню.

Магчыма, паўнавартаснае прызнанне дасягненняў этнапедагогаў і фалькларыстаў-тэарэтыкаў яшчэ наперадзе. Але гэта навукова-практычная канферэнцыя, якая штогод працуе ў нашым універсітэце і ўжо стала традыцыйнай, ёсць таксама сведчанне актыўнасці нацыянальнага культуратворчага працэсу.

Сардэчна жадаю плёну, адмысловых адкрыццяў, творчых поспехаў, выбітных дасягненняў супольнасці беларускіх удзельнікаў канферэнцыі, нашым адданым сябрам з суседніх краін, шаноўным носьбітам фальклору, якія сёлета завіталі да нас і бяруць удзел у канферэнцыі.

Рэктар
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Аліна КОРБУТ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ